# УПЛЫЎ ЧАСОПІСА «БЯРОЗКА» НА ФАРМІРАВАННЕ КУЛЬТУРЫ ПАДЛЕТКАЎ

**І. В. Скок, М. А. Лышчыцкая**

*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», г. Мінск*

Навуковы кіраўнік Д. П. Зылевіч, канд. філал. навук, дацэнт

У Беларусі няшмат часопісаў, якія былі б адрасаваныя дзецям сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. Так званыя тынэйджары рэдка купляюць часопісы і, тым не менш, калі перыядычнае выданне будзе выглядаць сучасна і стыльна, калі па змесце яно будзе адпавядаць чытацкім чаканням, то яно зможа знайсці сваіх прыхільнікаў сярод падлеткаў. Нашу ўвагу прыцягнуў часопіс «Бярозка», які выдаецца са снежня 1924 г., яго заснавальнікам з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Мэта дадзенага даследавання – ахарактарызаваць змест часопіса «Бярозка» з пункту гледжання яго ўплыву на фарміраванне культуры сучасных падлеткаў. Для рэалізацыі мэты былі вырашаны наступныя задачы: ахарактарызаваць гісторыю існавання часопіса; назваць асноўныя рубрыкі; даць ацэнку іх зместу з улікам чытацкага адрасу. Аб’ект даследавання – часопіс «Бярозка» (нумары за апошнія два гады).

Нямногія перыядычныя выданні могуць пахваліцца такім даўгалеццем, тым больш, выданні для юных чытачоў. Спачатку часопіс выходзіў пад назвай «Беларускі піянер». Тады амаль ў кожным нумары змяшчаліся матэрыялы пра жыццё і справы беларускай піянерыі. Але існавалі і іншыя рубрыкі. Да прыкладу, навукова-папулярныя. Галоўнай часткай часопіса «Беларускі піянер» была, вядома, літаратурная. Тут друкаваліся дзіцячыя творы самых разнастайных пісьменнікаў, у тым ліку і тых, якія пазней сталі класікамі беларускай літаратуры: Кандрата Крапівы, Уладзіміра Жылкі, Максіма Гарэцкага, Янкі Маўра і інш. Затым яго рэдакцыйная калегія падзялілася: пачалося выданне газеты «Піянер Беларусі» і часопіса «Іскры Ільіча», які выходзіў з кастрычніка 1929 па красавік 1941 г. З лета 1941 г., падчас другой сусветнай вайны, часопіс не выдаваўся. Быў адноўлены ў чэрвені 1945 г. пад сучаснай назвай. Стаўшы «Бярозкай», часопіс працягваў «адкрываць» для юных чытачоў новых і новых аўтараў, а многія з сучасных вядомых беларускіх пісьменнікаў калісьці, яшчэ школьнікамі, упершыню друкаваліся менавіта на старонках «Бярозкі». Да прыкладу, Уладзімір Мазго, Алесь Бадак, Алесь Карлюкевіч [1].

Але звярнемся да сучаснага выгляду часопіса. З 2017 г. галоўным рэдактарам стала Кацярына Вячаславаўна Захарэвіч, якая ўнесла вялікі ўклад у выгляд і змест часопіса. Дызайн змяняўся паступова яшчэ да прыхода К. В. Захарэвіч як галоўнага рэдактара, але свой сучасны выгляд набыў менавіта з ей.

Карэнным чынам змянілася вокладка: назва набыла свой унікальны выгляд, анонсы артыкулаў перасталі выносіць на вокладку. Уцэлым, вокладка стала падобна да першапачатковага стылю часопіса «Бярозка» 1945 г.: яе ілюстрыруе не фотаздымак, а абстрактны калаж. З прыходам новага мастацкага рэдактара з'явілася новая стылістыка, якая аб'ядноўвае ўвесь шэраг нумараў: дызайн часопіса набыў свой непаўторны выгляд, які больш падыходзіць сучаснаму густу падлеткаў.

У змесце таксама адбыліся змены: былі захаваныя некаторыя пастаянныя рубрыкі («Школа журналістыкі», «Верасок», «Літаратурныя старонкі», «Сітуацыя плюс», «Практыкум», «Адзін дзень», «Level 80»), а таксама дададзены новыя («Дайджэст», «Калумністыка», «З апошняй парты», «Праслушка» і інш.). Кожны нумар цяпер мае сваю асноўную тэму («Сімвал», «Рэакцыі», «Адрознасць», «Норма»), якая можа аб'ядноўваць шэраг часопісаў. Таксама тэма аб'ядноўвае ўсе артыкулы ў адным нумары.

Падрабязней часопіс мы разгледзім на прыкладзе першага выпуску за 2018 г.: тэма нумара – «Адрознасць».

У пастаяннай рубрыцы «Дайджэст» разглядаецца тэма «Пяць падманаў», у якой расказваецца аб пяці пачуццях (зрок, слых, смак, нюх, дотык), якія мае кожны чалавек. Не ва ўсіх людзей гэтыя пачуцці «вядуць сябе» аднолькава, што і подводзіць нас да тэматыкі нумара аб адрозненнях. Дадзеная інфармацыя вельмі добра ўплывае на адукаванасць моладзі, бо, мабыць, не кожны ведае такія «дробязі» пра наш арганізм. Гэта спрыяе рознабокаваму выхаванню падлеткаў.

У рубрыцы «Калумністыка» (калонку вядуць адны і тыя ж аўтары: Кацярына Захарэвич, Дзмитрый Шулюк): у гэтым нумары націск зроблены на дзіцячую псіхалогію, і аўтары вучаць падлеткаў не баяцца быць сабой і знайсці у сябе тыя якасці, якія маглі бы дапамагчы стаць прыкладам для пераймання. Гэта дапамагае моладзі стаць больш выхаванай, больш уважлівай да сябе і тых, хто з намі побач.

Падказаць кірунак развіцця для правядзення вольнага часу дапаможа рубрыка «Адзін дзень». Рубрыка «Месца» распавядае аб месцах, якія можна наведаць. Рубрыка «Праектар» знаеміць з кінематографам розных краін і часу. У рубрыцы «Нетэкст» распавядаецца аб японскім аўтары і яго творчасці, што дапаможа прывіць

школьніку любоў да чытання. Гэтыя артыкулы дапамагаюць падлетку заўважыць нешта цікавае не толькі ў сваім горадзе ці краіне, а нават адкрыць для сябе нешта новае і дагэтуль незнаемае пра іншыя краіны, што вельмі добра спрыяе развіццю далягляду падлетка.

У рубрыцы «Праслушка» настаўнікі дзеляцца сваімі думкамі, што дапамагае школьнікам зразумець дарослае пакаленне. Гэта своеасаблівы масцік паміж рознымі пакаленнямі, з дапамогай якога больш зручна пазбягаць канфліктаў у школе ці іншай установе.

У рубрыцы «Практыкум» упор робіцца на гісторыю, распавядаюцца разнастайныя гістарычаскія факты, якія можа прымяніць дзіця ў сваіх літаратурных спробах.

Рубрыкі «Школа журналістыкі», «Верасок» і «Літаратурная старонка» займаюць значнае месца ў часопісе. У рубрыкі «Верасок» і «Літаратурная старонка» школьнікі самі адпраўляюць розныя апавяданні і вершы і маюць магчымась быць апублікаванымі, што спрыяе развіццю творчага мыслення, мовы, пашырэнню слоўнікавага запасу.

Цікавы падыход да падбору артыкулаў на агульную тэму ў адным нумары вылучае часопіс сярод іншых. Гэтыя тэмы паступова і рознабакова адкрываюцца перад чытачом і вельмі важна тое, што яны датычацца думак кожнага падлетка. Часопіс дапамагае выявіць літаратурны патэнцыял школьнікаў, зрабіць сваю першую публікацыю і атрымаць пэўную крытыку.

Такім чынам, мы можам зрабіць вывад, што часопіс «Бярозка» закранае вялікі шэраг тэм, актуальных для падлеткаў. У іх фарміруюцца правільныя жыццевыя каштоўнасці і ідэалы. Часопіс выдаецца на беларускай мове, што вельмі добра ўплывае на моўную культуру падлеткаў.

Сення вельмі важна быць не толькі адукаваным, але і культурна выхаваным у тых сферах нашага жыцця, якія не вывучаюцца ў межах адпаведных школьных дысцыплін, але без якіх вельмі складана быць цікавым і сучасным маладым чалавекам, а часопіс «Бярозка» дапаможа набыць тыя веды, якіх не хапае падлетку, каб адчуваць сябе такім.

Літаратура

1. Пра нас // Звязда – 2016. – Рэжым доступу: http://zviazda.by/be/news/20160607/1465303551-pra-nas. – Дата доступу: 10.04.2018.